не тыпажу і побыту народа. Аформіў паэтычныя зборнікі «Вянок» М.Багдановіча (2-е выданне, 1927), «Шум бáравы» М.Васілька, «Веснапесні» Х.Ільяшэвіча (абодва 1929), «Жураўінавы цвет» (1937) М.Танка. Бел. пейзаж і рэаліі побыту шырока выкарыстаў пры афармленні вокладак часопісаў «Родныя гоні» (1927), «Беларуская культура» (абодва 1927), дзіцячага часопіса «Заранка» (1927—31), газеты Бел. сялянска-рабочай грамады «Народны звон» (1926). Стварыў малюнак да вокладкі «Беларускіх народных песень» (1929) Р. Шырмы. У свабоднай манеры аформіў «Беларускі дзіцячы спеўнік» (1925) А.Грыневіча. Тэхнікай акварэлі ў зборніку «Беларускія (крывіцкія) казкі» (1919, склаў Я.Станкевіч) стварыў вобразы бел. чарадзейных казак (каваля-Вярнідуба, асілка, Рымшы, Іванкі-прастачка). Намаляваў таксама вокладку гэтага зборніка. У «Беларускім календары на 1927 год» стварыў серыю гравюр з 12 малюнкаў, адпаведных назвам кожнага месяца (выкарыстаны ў календарах на 1928 і 1929 г.). Яны сведчаць пра арганічную сувязь творчасці мастака з традыцыйнай духоўнай і матэрыяльнай культурай бел. народа, умелае выкарыстанне ім вобразных рэалій гаспадарчай дзейнасці бел. селяніна, айчыннага краявіду, яго танальнасці, агульнага настрою.

*Літ.*: Ліс А. Пякучай маланкі след. Мн., 1981; Марачкін А. Выяўленчае мастацтва Заходняй Беларусі // Гісторыя беларускага мастацтва. Мн., 1990. Т. 4.

*А. С. Ліс.*



*Я. Горыд* Ілюстрацыя да казкі «Змей». 1929.




*Я. Горыд* Вокладка кніжкі «Беларускія (крывіцкія) казкі» 1929.

**«ГО́СЦІЦА»**, фальклор-тэатр. Створаны ў 1994 на базе дзіцячага фалькл. ансамбля (існаваў з 1986) тэлерадыёкампаніі. Арганізатар і мастацкі кіраўнік — Л.Сімаковіч. Арганічны сінтэз фалькл. харэаграфічнай традыцыі і свабодная пластыка танца мадэрн у вырашэнні спектакляў, сучасныя музычныя кампазіцыі, дзе спалучаюцца разнастайныя стылёвыя формы і аўтэнтычнасць, вызначаюць індывідуальнасць і непаўторнасць сцэнічнага дзейства, глыбінная аснова якога—рытуальна-абрадавая сімволіка і вобразнасць, гульнявы пачатак, сінкрэтызм. У большасці пастановак пераважаюць бел. нац. тэмы і жанравыя канцэпцыі. Сярод іх: 1-актовыя сцэнічныя кампазіцыі «Інтуіцыя міту» (1994), «Эўтаназія. Апошні рытуал» (1996), «Нацыянальны інтарэс» (1997), «Каралеўства Беларусі» (1998), сучасная байка «Жах» (1999), тэлевізійныя фільмы-балеты, створаныя на аснове сцэнічных пастановак— «Нябога», «Някраса» (абодва 2001), мініяцюра «Яблычны спас» (музыка і харэаграфія ўсіх Л.Сімаковіч). 1-я прэмія Нац. конкурсу сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (1994).

*Літ.*: Чурко Ю.М. Линия, уходящая в бесконечность. Мн., 1999. С. 24—28.

*В. Р. Гудзей-Каштальян.*

**ГРАБЕНШЧЫКО́Ў** Сяргей Міхайлавіч (2.10.1918, г. Вышні Валачок Цвярской вобл., Расія — 10.6.1987), балетмайстар, педагог. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1960). Скончыў Усесаюзны тэхнікум цыркавога мастацтва (1936). У 1953—68 балетмайстар мінскага нар. ансамбля танца «Дружба» Бел. політэхнічнага інстытута, аднача-



*Фальклор-тэатр «Госціца» на фестывалі сучаснага фальклору «Таўкачыкі». 2004.*

сова ў 1955—71 метадыст, балетмайстар Рэспубліканскага Дома нар. творчасці. З 1977 выкладаў бел. танец у Мінскім інстытуце культуры. Надаваў увагу сучаснай тэматыцы ў сцэнічнай інтэрпрэтацыі бел. танцавальнага фальклору: «Радасць», «Вясна», «Маладзёжная полька», «Саспернікі», «Спатканне» і інш. Аўтар танцаў на аснове бел. фальклору: «Крыжачок», «Жураўлі», «Зязюля», «Ланская кадрыля», «Антон маладзенькі» і інш. Выдаў зборнікі па бел. сцэнічнай харэаграфіі: «Сцэнічныя беларускія танцы» (1974), «Беларуская народна-сцэнічная харэаграфія» (1976), «Беларускія танцы» (1978).

*С. В. Гуткоўская.*

**ГРАД**. У традыцыйнай народнай культуры Г. успрымаўся як божае пакаранне за людскія грахі ці парушэнне звычайнага, наладжанага парадку. Прычынай Г. звычайна лічылася парушэнне маральных норм, у прыватнасці, нараджэнне дзяўчынай пазашлюбнага дзіцяці, або грэх маці, якая пазбавілася (забіла, утапіла ці нават выпадкова «прыспала») ад немаўляці (характэрнае сведчанне з в. Арэхава Маларыцкага раёна: па дарозе, дзе жанчына несла забітае дзіця ў чужую вёску, Г. ішоў цэлы год да восені і ўсё пабіў на палетках). Градабой мог таксама здарыцца ад парушэння шматлікіх *забаронаў.* Забаранялася працаваць у т.зв. градавыя дні, звычайна ў *Градавую сераду*, араць у свята Кірылы і Мяфодзія (24 мая), везці нябожчыка на могілкі ў адкрытай труне (Заходняе Палессе); у вызначаныя дні ці святы [напрыклад, *Каляды, Чысты чацвер,* Фамін тыдзень, т.зв. траецкі тыдзень (Віцебшчына)] была забарона на грукат (бярэмем дроў ці пранікам), спалучаны з біццём, таму што «град б'е». Важнымі з'яўляюцца звязаныя з абаронай ад Г. абрадава-рытуальныя практыкі, якія праяўляюцца ў прафілактычных, пасіўных і актыўных формах. Кожная з іх рэалізуецца ўнутры акцыянальнага, прадметнага і вербальнага кодаў традыцыйнай культуры (альбо іх разнастайных карэляцый) і, такім чынам, выяўляецца праз дзеянне, прадмет ці тэкст. З мэтай папярэдняй (прафілактычнай) абароны на веснавога *Юр'я* абыходзілі палеткі з азімымі (тое ж на дзень Кірылы і Мяфодзія); на мяжы рабілі адмысловае частаванне, на гэтым жа месцы закопвалі косткі ад велікоднага парасяці, палі апярэзвалі ніткамі, якія выцягвалі з *абыдзённіка* (раён Ваўкавыска). У гэты ж дзень на Гродзеншчыне гаспадар выходзіў на поле з косткамі ад велікоднага парасяці, уторкваў іх у зямлю па вуглах поля і гаварыў: «Святы Божа, святы Еры (Ягорый), захавай ніўку ад граду!». Напярэдадні першых навальніц паўсюдна ўторквалі ў зямлю галінкі асвячонай вярбы (ці проста пакідалі іх на полі). Семантыку калектыўнай прафілактычнай абароны ад Г. (і ад *грому*) захоўваюць у сабе таксама ўсходнепалескія абрады і рытуалы веснавога цыкла Ваджэння *«стралы»* (звычайна выконваюцца на *Ушэсце*), асабліва ў запісах з Веткаўшчыны. Вербальнымі апатрапеямі (ахоўнікамі) з'яўляюцца тут і шматлікія песні, якія выконваюцца падчас карагодаў і прамалінейнага руху ўздзельнікаў у поле — з поля. Каб Г. не пабіў пасевы, у в. Дружылавічы Іванаўскага раёна поле засявалі зернем з дажынкавага вянка, асвячонага на *Прачыстую.* Пасіўная абарона найчасцей звязана з выстаўленнем (выкідваннем) за парог дома прадметаў, звязаных з агнём: хлебнай лапаты (іншы раз перавернутай з мэтай адварочвання градавой хмары), качаргі, вілаў; зрэдку разам з лапатай выкідваўся дзяркач (в. Стадолічы Лельчыцкага раёна), выстаўлялася дзежка або века ад яе (Хойніцкі раён). Паўсюдна абараняліся ад Г. запаленай, звычайна *грамнічнай свечкай* і часам т.зв. чацвярговай (асвячонай у Чысты чацвер), спальваннем галінак вярбы, асвячонай у Вербную нядзелю (гл. *Вербніца*), а таксама перакусваннем, глытаннем ці ўкідваннем у печ асобных градзінак (першай ці першых трох), што часцей рабіла першае ці апошняе дзіця ў сям'і. Актыўная абарона ад Г. найперш звязана і з паўсюдна вядомым «захрэшчваннем» (перахрэшчваннем) градавой хмары. Адмысловым магічным прадметам аналагічнага ўздзеяння на хмару з'яўляецца палка, якою ўдалося адагнаць прагную змяю ад жабы (Палаччына, Цэнтральнае і Усходняе Палессе). Для градавых і навальнічных хмар адгонны характар мае заклінальная функцыя слова, найперш замоўная традыцыя, адлюстраваная тут, аднак, слаба (зафіксавана ў Маладзечанскім раёне):

Туча, туча, ідзі бокам,
Апыніся над Глыбокім:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ